**26.** Пераблыталіся часткі прыказак: *1) сёння зробіш; 2) адною рукою; 3) лепей крышку зрабіце; 4) лета прагуляеце; 5) чым багата нагаварыце; 6) заўтра як знойдзеш; 7) восенню не зберыце; 8) і вузла не завяжаш.*
Выберыце правільныя варыянты.

**А)** 1-5, 2-7, 3-6, 4-8. **Б)** 1-7, 2-6, 3-5, 4-8. **В)** 1-6, 2-5, 3- 8, 4-7.
**Г)** 1-8, 2-7, 3-6, 4-5. **Д)** 1-6, 2-8, 3-5, 4-7.

**27.** Якая прыказка зашыфравана лічбамі, што абазначаюць месца пэўнай літары ў беларускім алфавіце:

5, 28, 14, 21, 2, 6, 9, 1, 4, 15, 31, 15, 6, 2, 28, 3, 1, 6?

*1) У розуму тысячы вачэй. 2) Дзе веды, там смеласць.*
*3) Дыму без агню не бывае. 4) Агонь агнём не тушаць.*

**А)** няма правільнага варыянта. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**28.** Разгадайце загадку: *Стаіць сасна, на сасне лён, на льне жыта.*

**А)** стол, абрус, хлеб. **Б)** дрэва, каласы, зерне. **В)** гара, трава, ручай.
**Г)** хата, дах, комін. **Д)** дах, палавік, мех.

**29.** Якое сапраўднае імя Зоські Верас?

**А)** Людвіка Антонаўна Сівіцкая-Войцік.
**Б)** Марыя Уладзіміраўна Багушэвіч. **В)** Марыя Чарноўская.
**Г)** Соф'я Васільеўна Корвін-Крукоўская.
**Д)** Францішка Уршуля Радзівіл.

**30.** У якім парадку трэба размясціць дадзеныя словы, каб у выдзеленых клетках па дыяганалі злева направа можна было прачытаць слова-назву твора Алеся Пісьмянкова, асноўная думка якога ў тым, што вопыт папярэднікаў – духоўны грунт чалавека і крыніца яго аптымізму?

*1) проста; 2) пруткі; 3) пабыць; 4) пробка; 5) прабел; 6) прадам.*



**А)** 1, 5, 2, 4, 3, 6. **Б)** 4, 2, 3, 5, 6, 1. **В)** 2, 3, 6, 1, 5, 4.
**Г)** 6, 1, 4, 3, 2, 5. **Д)** 3, 5, 1, 6, 4, 2.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3, тэл. (017) 292 80 31, 292 34 01, 290 01 53
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 11. Тыраж 38900 экз. г. Мінск. 2011 г.

# Конкурс па беларускай мове
# «БУСЛІК-2011»

*Чацвер, 17 лютага 2011 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

## Заданне для вучняў 5-6 класаў

**1.** Якога слова не хапае ў словах Якуба Коласа:

*Вось паслухай, зрабі ласку:*
*Раскажу табе я ... ?*

**А)** гісторыю. **Б)** загадку. **В)** прыказку. **Г)** смяшынку. **Д)** казку.

**2.** Колькі чалавек у дружнай сямейцы, пра якую расказаў у вершаваных радках М. Маляўка?

*Дружная сямейка:*
*Мама, тата, дзед,*
*Васілёк, Сяргейка,*
*Глеб і я, Міхед.*

**А)** 4. **Б)** 5. **В)** 6. **Г)** 7. **Д)** 8.

**3.** Падбярыце з прапанаваных сінонім да слова ***палагаднела***:

**А)** разгневалася. **Б)** падабрэла. **В)** ацерабілася.
**Г)** папрыгажэла. **Д)** выспалася.

**4.** Як называецца ўчастак поля, які выкарыстоўваецца пад пасевы?

**А)** узлесак. **Б)** палетак. **В)** луг. **Г)** пералесак. **Д)** прыбярэжжа.

**5.** Вызначце з прыведзеных мнагазначнае слова:

*1) іголка; 2) самалёт; 3) тралейбус.*

**А)** няма мнагазначнага слова. **Б)** усе словы мнагазначныя. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**6.** У якіх словах замест пропуску напішаце літару **э**:

*1) т..левізар; 2) гард..роб; 3) т..атр; 4) т..лефон?*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** ва ўсіх словах, акрамя 4. **В)** 1, 3, 4. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**7.** Выберыце з прыведзеных слоў толькі назоўнікі жаночага роду:

*1) ручай, 2) куст, 3) ноч, 4) лета, 5) далонь, 6) сонца, 7) дрэва.*

**А)** 1, 2. **Б)** 3, 5. **В)** 4, 6. **Г)** 5, 6. **Д)** 6, 7.

**8.** Вызначце склон выдзеленых назоўнікаў у вершаваных радках Якуба Коласа: *Пабяліла зіма і* ***палі****, і* ***лугі****, І* ***сады****, і* ***лясы****, і над рэчкай* ***стагі****.*

**А)** назоўны. **Б)** родны. **В)** давальны. **Г)** вінавальны. **Д)** творны.

**9.** У якім слове з дадзеных усе зычныя мяккія?

*1) дарога; 2) дзень; 3) плынь.*

**А)** усе словы. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**10.** Колькі разоў паўтараецца [а] у словах сказа?

*Аднойчы, калі моцна разгулялася мяцеліца, нехта пастукаў у акно.*

**А)** 10. **Б)** 11. **В)** 12. **Г)** 13. **Д)** 14.

**11.** *Люлі, люлі, люлі,*
*Прыляцелі гулі,*
*Селі на варотах*
*У чырвоных ботах ...*

Дадзеныя радкі з'яўляюцца пачаткам … .

**А)** заклічкі. **Б)** прыказкі. **В)** лічылкі. **Г)** забаўлянкі. **Д)** калыханкі.

**12.** Якім членам сказа з'яўляюцца выдзеленыя ў тэксце словы?

*Расцвітае луг* ***вясновым*** *цветам,*
*Пчолы пачалі* ***мядовы*** *збор.*
*За азёрамі пад небам* ***светлым***
*Не сціхае птушак* ***звонкі*** *хор. (А. Русак)*

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** дапаўненнем.
**Г)** азначэннем. **Д)** акалічнасцю.

**13.** Размясціце дадзеныя сказы так, каб атрымаўся тэкст.

*1) Матылькі, жучкі пазалазілі ў чашачкі кветак.*
*2) Буйныя кроплі ўпалі на лісты дрэў, на зямлю.*
*3) У лесе нечакана пайшоў дождж. 4) І ўсе пачалі хавацца ад дажджу.*

**А)** 1, 2, 3, 4. **Б)** 2, 1, 4, 3. **В)** 3, 2, 4, 1. **Г)** 4, 3, 2, 1. **Д)** 4, 3, 1, 2.

**14.** Вызначце з дадзеных лексічнае значэнне слова ***гарлачык***: *1) паданне пра старадаўнія часы; 2) круглы пірог; 3) вадзяная лілея; 4) павучальны выраз.*

**А)** няма правільнага значэння. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**15.** Якія тры літары ёсць у рускім алфавіце, але адсутнічаюць у беларускім?

**А)** няма такіх літар. **Б)** ъ, щ, и. **В)** щ, и, ь. **Г)** ъ, и, й. **Д)** ъ, ш , и.

**16.** Якія словы з дадзеных запісаны правільна?

*1) степь; 2) глыб; 3) дробь; 4) восем.*

**А)** усе словы запісаны правільна. **Б)** няма правільна запісаных слоў.
**В)** 1, 3. **Г)** 2, 3, 4. **Д)** 2, 4.

**17.** Вызначце з дадзеных сказы з аднароднымі членамі: *1) Руплівыя і працавітыя пчолы збіраюць мёд. 2) Вучні стараюцца дапамагаць ветэранам. 3) У лесе хлопчык назбіраў поўны кошык баравікоў і падасінавікаў. 4) Ціха шумелі у парку таполі.*

**А)** усе сказы. **Б)** 1, 2, 3. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 2, 3.

**18.** У якім радку запісаны дзеяслоў?

*1) белы, пабелка, пабелены; 2) смешны, смяецца, смех;*
*3) зіма, зімоўка, зімовы.*

**А)** усе радкі. **Б)** няма такога радка. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**19.** Вызначце з дадзеных развітыя сказы: *1) Пішчаць птушаняты. 2) Дзеці дружна працуюць. 3) Вясна прынясе цяпло. 4) Заспявай мне песню.*

**А)** няма развітых сказаў. **Б)** усе сказы развітыя. **В)** усе сказы, акрамя 1.
**Г)** 2, 3. **Д)** 1, 2, 4.

**20.** Якое месца па ліку ў беларускім алфавіце займае літара ***ў***?

**А)** 12. **Б)** 16. **В)** 20. **Г)** 22. **Д)** 24.

**21.** Вызначце слова, у якім няма прыстаўкі:

*1) раскусіць; 2) расціць; 3) растрэсці.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такога слова. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**22.** Якія назоўнікі з дадзеных нельга паставіць у форме множнага ліку?

*1) арэх; 2) гліна; 3) шпак; 4) вецер; 5) цукар.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 5. **Д)** 3, 4.

**23.** *Празрыстую смалу на ствалах хвойных дрэў* называюць … .

**А)** сокам. **Б)** мёдам. **В)** пацярухай. **Г)** варэннем. **Д)** жывіцай.

**24.** Падбярыце з прапанаваных сінонімы да фразеалагічнага выраза ***два боты пара***: *1) аднаго поля ягада; 2) ні адсюль ні адтуль; 3) абуваць у лапці; 4) з аднаго цеста спечаны; 5) на адзін манер; 6) зямлі не чуць пад сабой.*

**А)** усе выразы. **Б)** 1, 4, 5. **В)** 2, 3, 6. **Г)** 3, 5. **Д)** 4, 5, 6.

**25.** Якія дзеясловы з дадзеных ужыты ў форме 2-ой асобы множнага ліку?

*1) маўчыце; 2) просяць; 3) берагуць; 4) бяжым; 5) кажаце.*

**А)** усе дзеясловы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 5. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.